9. *Мизернюк, Н.* К истории Виленского музея древности / Н. Мизернюк // Cyberleninka.ru. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/k-istorii-vilenskogo-muzeya-drevnostey/viewer. – Дата доступа: 01.04.2021.

*10.* Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. даведнік / Беларус. энцыкл. ; гал. рэд.: Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1995. – 671 с.

*11.* Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / рэдкал.: С. А. Умрэйка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 1968. – 621 с.

А. А. ТРУСАЎ

## ПЕРШЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВКЛ

Ідэю стварэння агульнадаступнага музея ў Расійскай імперыі адным з першых вылучыў былы студэнт Віленскага ўніверсітэта Тамаш Зан (1796–1855), які пасля вяртання са ссылкі ў Арэнбургу ў 1841 г. жыў у Беларусі.

Будучы ў ссылцы, ён у 1830 г. звярнуўся да губернатара з прапановай стварыць мясцовы музей у Арэнбургу і даслаў пры гэтым падрабязны праект будучага музея. Прычым у ім была таксама выказана думка аб стварэнні нацыянальнага музея на базе рэгіянальных мясцовых музеяў. Рэгіянальныя мясцовыя музеі разглядаліся ім як творчыя лабараторыі нацыянальнага музея і складалі з ім адзінае цэлае [4, с. 74–76].

Аднак гэтую ідэю Т. Зана мясцовыя ўлады не падтрымалі. Амаль адначасова з Т. Занам ідэю стварэння вялікага рэгіанальнага музея, а па сутнасці музея гісторыі ВКЛ, распрацаваў Яўстафій Тышкевіч. Яшчэ ў 1851 г. ён прапанаваў стварыць Віленскі музей старажытнасцей і пры ім археалагічную камісію. Гэту ідэю падтрымаў мясцовы губернатар Бібікаў і накіраваў просьбу імператару аб стварэнні такога музея, як добрую ідэю для «Паўночна-Заходняга краю». Аднак мясцовыя чыноўнікі былі супраць. Адзін з іх, Бацюшкаў, дарэчы, родны брат вядомага рускага паэта, пісаў, што Літвы як законнага тэрміна ў Расійскай імперыі не існуе, і гэты праект можа спрыяць стварэнню антырускай кааліцыі [1, с. 62].

У выніку імператар Мікалай I гэты праект не падтрымаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак пасля смерці Мікалая I (18 лютага 1855 г.) сітуацыя палепшала з прыходам да ўлады Аляксандра II. Ён змяніў стаўленне да Каралеўства Польскага, што прывяло да прыкметнага ажыўлення эканамічнага і культурнага жыцця ў гэтым рэгіёне Расійскай імперыі. Польскія гісторыкі называюць перыяд з 1853 па 1861 г. Севастопальскай адлігай [6, с. 44].

Калі новы імператар прыехаў у Вільню, то 29 красавіка 1855 г. зацвердзіў «Палажэнне аб Музеуме старажытнасцей і часовай археалагічнай камісіі ў Вільні». Музей і камісія падпарадкоўваліся Міністэрству народнай асветы і мелі адзіны штат. Сябрамі камісіі сталі асобы з вопытам навуковых даследаванняў. Старшыня і апякун камісіі – Я. Тышкевіч, намеснік – М. Балінскі, навуковы сакратар – М. Круповіч. У камісію ўвайшлі – археолаг К. Тышкевіч, былыя прафесары Віленскага ўніверсітэта І. Ярашэвіч, І. Гамаліцкі, гісторыкі І. Крашэўскі і Т. Нарбут, краязнаўца і паэт У. Сыракомля і іншыя [3, с. 66–67].

1 студзеня 1856 г. віленскі генерал-губернатар зацвердзіў спіс сяброў Віленскага музея старажытнасцей і Віленскай археалагічнай камісіі ў колькасці 51 чалавека. Сярод іх 15 сапраўдных членаў, 8 – ганаровых, 18 членаў-папячыцеляў і 9 членаў-супрацоўнікаў. Камісія збірала матэрыялы па гісторыі краю, звесткі пра ўладальнікаў археалагічных матэрыялаў, рукапісы, ладзіла археалагічныя экспедыцыі, слухала даклады і рэфераты па краязнаўстве. Дзейнасць камісіі асвятлялася ў друку, а таксама выходзілі асобныя краязнаўчыя працы.

Пад музей выдзелілі залу публічных пасяджэнняў былога Віленскага ўніверсітэта. Пасля года падрыхтоўкі 17 красавіка 1856 г. экспазіцыя музея была ўрачыста адкрытая. Інтэр’ер музея аздаблялі гербы Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, гербы Вільні, Гродна і Мінска. Дарэчы, сам Я. Тышкевіч лічыў, што музей павінен адлюстраваць гісторыю жыцця і дзейнасці «літоўска-рускага народа», што азначае жыхароў ВКЛ. Значыць, пра палякаў і Польшчу тут гаворкі не было. У экспазіцыі існавалі калекцыі манет і медалёў; гравюр, геаграфічных картаў і атласаў; карцін, партрэтаў і скульптур; дыпломаў, рукапісаў і аўтографаў гістарычных дзеячаў, археалогіі (вынікі раскопак на тэрыторыі Беларусі і Літвы, а таксама



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артэфакты, прывезеныя Я. Тышкевічам са Скандынавіі). Была ў музеі і добрая бібліятэка.

11 студзеня 1856 г. на першым пасяджэнні Віленскай археалагічнай камісіі Тышкевіч прапанаваў скласці асобныя каталогі па ўсіх раздзелах музея. Каталог па археалагічных экспанатах узяўся складаць А. Кіркор.

Музей стаў хутка папаўняцца. Так, браты Тышкевічы перадалі ў музейныя фонды матэрыялы археалагічных раскопак, кнігі для бібліятэкі і розныя творы мастацтва.

Шмат экспанатаў ахвяравалі І. Ходзька, А. Кіркор, Т. Нарбут, І. Крашэўскі, М. Балінскі, віленскі мітрапаліт Іосіф. Сын К. Тызенгаўза перадаў славутую калекцыю арніталогіі, якую сабраў яго бацька. Неўзабаве ў музеі адкрылася асобная прыродазнаўчая зала, дзе сталі працаваць даследчыкі-натуралісты.

Увесь час паступалі рэчы з розных гарадоў і мястэчак, якія пазначаліся ў спецыяльнай кнізе рэгістрацыі. Есць у ёй і запіс аб ахвяраванні ў музей, зроблены шаснаццацігадовым гімназістам, будучым беларускім паэтам Францішкам Багушэвічам [5, с. 85].

Гэта быў сапраўдны публічны музей, бо яго маглі наведаць прадстаўнікі ўсіх станаў два дні на тыдзень па чатыры гадзіны ў дзень. Толькі за 1856 г. яго наведалі 7150 жыхароў Вільні і людзей, якія спецыяльна прыехалі з розных мясцін. У верасні 1858 г. з музеем азнаёміўся Аляксандр II. Экспазіцыя яму спадабалася, і ён пагадзіўся ўзяць музей пад асабістую апеку.

Сітуацыя ў краіне рэзка змянілася пасля паўстання 1863 г. У Расійскай імперыі была згорнута польская навука, і таму шмат польскіх навукоўцаў эміgравалі ў больш ліберальную Аўстра-Венгрыю. Пацярпела моцна і Беларусь, дзе былі спынены даследаванні ў галіне археалогіі, археаграфіі і этнаграфіі. Культурныя і гістарычныя традыцыі ВКЛ сталі ідэнтыфікавацца як «рускія». А. Кіркор стаў гаварыць пра «Беларусь, якая замяніла нам Літву», і што «князі літоўскія былі, верагодна, рускага паходжання» [2, с. 79].

Пасля прыезду ў Вільню М. Мураўёва ўзяліся і за віленскі музей. З 1864 г. на пасяджэннях Віленскай археалагічнай камісіі сталі з'яўляцца афіцыйныя асобы і патрабаваць абрання ганаровымі сябрамі камісіі людзей, якія кіравалі рэпрэсіямі су-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праць паўстанцаў. Музей аб’явілі цэнтрам паланізму, і яго дзейнасць даручылі разгляду спецыяльнай камісіі пад кіраўніцтвам генерал-маёра А. Д. Сталыпіна.

На першым пасяджэнні гэтай камісіі 3 сакавіка 1865 г. зачыталі «Прапанову» М. Мураўёва, дзе паведамлялася, што значная частка музейнай калекцыі адносіцца да «чуждой этому краю польскай народности». Мураў’ёў прапанаваў значна змяніць экспазіцыю музея, а некаторыя экспанаты, асабліва партрэты польскіх каралёў, «собрать особо и разместить в отдельном зале впредь до далейшых об оных распоряжениях». Камісія зачыніла музей і запатрабавала ўсе музейныя каталогі. Я. Тышкевіч напісаў «Протест», дзе адзначыў, што пры стварэнні музея меліся на ўвазе «древности и памятники не польскія, но местныя, т. е. литовско-руския» [1, с. 82].

У выніку Я. Тышкевіч зняў з сябе абавязкі апекуна музея. Пасля гэтага з экспазіцыі забралі 256 экспанатаў, а сам музей перадалі Віленскай вучэбнай акрузе.

Ворагі Тышкевіча пісалі пра яго розную хлусню, раскрадалі альбо псавалі сабраныя ім экспанаты. Сам Яўстах Тышкевіч з’ехаў з Вільні і памёр у 1868 г.

Тым не менш віленскі музей працягваў сваё існаванне. У сакавіку 1868 г. у Вільні з’явіўся новы генерал-губернатар А. Патапаў, які стаў праводзіць больш гнуткую палітыку ў дачыненні да мясцовага насельніцтва. Мураўёўскую рэвізію музея ён абвесціў ненавуковай і нават шкоднай. Музею вярнулі забраныя раней 256 экспанатаў. Аднак у 1874 г. прыхільнікі палітыкі Мураўёва на чале з П. Бацюшкавым дабіліся адстаўкі А. Патапава, якога перавялі ў Санкт-Пецярбург, і зноў сталі праводзіць «русіфікацыю» музея. Усе экспанаты, якія залічылі ў «польскія», перавезлі ў Маскву [1, с. 95]. Рэшткі музея праіснавалі да пачатку Першай сусветнай вайны.

Музей на працягу 50 гадоў быў пры Віленскай публічнай бібліятэцы, яго плошчу скарацілі, а ў штаце пакінулі толькі два чалавекі. Новае жыццё вярнуў музею IX Археалагічны з’езд, які прайшоў у Вільні у 1893 г., калі музею перадалі каштоўныя археалагічныя экспанаты. У пачатку XX ст. беларускія даследчыкі ставілі пытанне аб вяртанні з Масквы канфіскаваных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспанатаў, але марна. У 1915 г. Віленскі музей старажытнасцей быў эвакуіраваны ў Маскву, дзе спыніў свае існаванне.

1. *Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси. XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларус. навука, 1996. – 206 с.

2. *Булгакаў, В.* Гісторыя беларускага нацыяналізму / В. Булгакаў. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2006. – 326 с.

3. *Гужалоўскі, А. А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с.

4. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

5. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 117 с.

6. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X–XXI стст. / рэд. і ўкл. М. Семаковіч ; пер. Г. Цішук. – Варшава : Demart, 2005. – 312 с.

А. Д. КРЫВАЛАП

## «ВОБРАЗЫ ПОБЫТАВАГА ЖЫЦЦЯ Ў ЛІТВЕ» Ў ТВОРЫ Я. ТЫШКЕВІЧА ЯК ДАСЛЕДАВАННЕ КУЛЬТУРЫ ШТОДЗЁННАСЦІ

Артыкул прысвечаны кнігам Яўстафія Тышкевіча «Вобразы побытавага жыцця ў Літве», першы том выдадзены ў 1865 г., другі ў 1867 г. Мы не будзем спрабаваць ацэньваць літаратурную каштоўнасць, параўноўваць з іншымі славутымі майстрамі слова XIX ст. Замест гэтага паспрабуем прачытаць гэтыя мастацкія тэксты як дакументальныя сведчанні эпохі, каб вызначыць, якую гісторыю яны здольны распавесці нам сёння.

Спачатку акрэслім магчымасці і падыходы метаду аналізу дакументаў, які шырока выкарыстоўваецца ў сацыяльна-гуманітарных даследаваннях. Працу з дакументамі ў шырокім сэнсе магчыма аднесці як да якаснай, так і да колькаснай метадалогіі. Калі падлічваюцца колькасныя паказчыкі, калі вынікам даследавання будуць лічбы ў любым выглядзе, то размова ідзе пра колькасную метадалогію. Калі разглядаюцца адзінкавыя выпадкі і логіка даследавання імкнецца не да масавасці ахопу, а да глыбіні ў працы з унікальным матэрыялам, то гэта якасныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ